ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 279 (1246) ЧАЦЬВЕР, 4-га сьнежня 1930 г.

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Падрыхтоўка ўзброенага нападу на СССР—

вось дзеяньні шпіёнаў польскага фашызму, агэнтаў імпэрыялізму—беларускіх нацыянал-дэмократаў—Ластоўскіх, Лёсікаў, Цьвікевічаў і інш.

Працоўныя масы патрабуюць жорсткай кары контр-рэвалюцыянэрам

ПРОТЭСТ БелАПП'у

Беларуская Асоцыяцыя пролетарскіх пісьменьнікаў бязьмежна абурана шкоднасьцю контррэволюцыйнай арганізацыі беларускіх нацыянал-дэмократаў. Чорная зграя былых белых міністраў, афіцэраў, царскіх чыноўнікаў і буржуазных інтэлігентаў, прыкрываючыся ілжывымі сказамі аб жаданьні працаваць пад кіраўніцтвам савецкай улады і комуністычнай партыі, хаваючы сваю контррэволюцыйную нацыянал-дэмократычную сутнасьць, не пакідала сваёй шкодніцкай працы, рыхтавала зьнішчэньне дыктатуры пролетарыяту, шляхам арганізацыі інтэрвэнцыі рыхтавала рэстаўрацыю буржуазнага ладу. Гэтыя контррэволюцыянэры рыхтавалі няволю рабочым і працоўным масам сялянства, у імя інтарэсаў кулацтва і буржуазіі. Замест Савецкай Беларусі, дзе рабочыя, у саюзе з асноўнымі масамі сялянства, пры брацкай дапамозе працоўных СССР, выбывала шпаркімі тэмпамі будуюць соцыялістычную гаспадарку, сваю нацыянальную па форме і соцыялістычную па зьместу культуру, будуюць новае жыцьцё,—беларускія контррэволюцыйныя нацыянал-дэмократы рыхтаваліся ўстанавіць буржуазна-фашыстаўскую дзяржаву—калёнію заходняга капіталу.

Ім не спадабалася, што памешчыцкія і царскія землі перададзены вясковай бядноце, батракам і незаможнаму сялянству. Шалёна ненавідзелі яны палітыку савецкай улады на колектывізацыю і зьнішчэньне на яе базе кулацтва, як клясы. Яны прыхільнікі сталыпінскай політыкі ў мінулым, у часы „Нашаи Нівы“, праслаўлялі гэту палітыку і імкнуліся зноў устанавіць прыватную ўласнасьць і вярнуць зямлю памешчыкам і кулакам, а фабрыкі —капіталістым. Яны пралезьлі ў органы Наркомзему, каб там праводзіць сваю контррэволюцыйную буржуазна-кулацкую дзейнасьць у выглядзе прымусовай …паўскай хутарызацыі.

Яны хацелі ўплываць ідэолёгічна на масы моладзі—яны пралазілі ў органы Наркомасьветы, у школы і дасьледчыя інстытуты і адтуль імкнуліся затуманіць клясавую сьвядомасьць мас. Яны высоўвалі старых буржуазных нацыянал-дэмократычных спэцаў і імкнуліся перашкодзіць падымацца больш здольным маладым кадрам з рабочых і працоўнага сялянства. Яны пралезьлі ў органы Белдзяржвыдавецтва, каб адтуль весьці барацьбу супроць беларускай пролетарскай літаратуры і соцыялістычнай культуры. Яны пранікалі ў рады літаратурных арганізацый і тэатраў і адтуль імкнуліся дэзорганізаваць і шкодзіць разьвіцьцю пролетарскага мастацтва і літаратуры. Нац.-дэмократам удалося нават пашырыць свой уплыў і на паасобных, менш устойлівых членаў БелАПП'у. У галіне мовы яны орыентаваліся на засьмечваньне беларускай мовы полёнізмамі і незразумелымі новатворамі і сыстэматычна прасьледвалі ўсякія савецызмы, маючы на мэце адарваць беларускую культуру ад пролетарскіх культур іншых народаў СССР. Яны ідэалізавалі мінуўшчыну, высоўвалі лёзунг орыентацыі на буржуазны Захад, каб адарваць разьвіцьцё беларускай культуры ад пролетарскага шляху, каб накіраваць гэтае разьвіцьцё ў рэчышча буржуазнай нацыяналістычнай культуры.

Зьяўляючыся выказьнікамі інтарэсаў кулацтва і буржуазіі, маскуючыся гутаркамі аб адзінстве беларускай нацыі—з мэтай прытупіць клясавую чуйнасьць працоўных да сваіх ворагаў,—зграя беларускіх контррэволюцыйных нацыянал-дэмократаў на справе змыкалася з заядлымі ворагамі беларускай нацыі— расійскімі чорнасоценцамі і польскімі памешчыкамі і фашыстымі. У часе царызму і пры керанщчыне сёньнешнія „незалежнікі“ не ішлі далей куцай „аўтаноміі“ Беларусі ў складзе расійскай капіталістычнай дзяржавы. У часы Дзянікіна яны былі за „адзіную недзялімую“, а нядаўна ў потайкох цiскалі руку манархісту і вялікадзяржаўніку Карскаму. У мінулым яны славілі кайзэра Вільгельма і прaкланяліся перад Пілсудзкім, а нядаўна яны вялі т а й н ы я перагаворы з агэнтамі польскага фашызму і славілі на старонках савецкіх выданьняў фашыцкага агэнта Луцкевіча.

Што іх яднала з расійскімі чорнасоценцамі і польскімі і зах. імпэрыялістычнымі фашыстымі?

Яднала іх супольная нянавісьць да дыктатуры пролетарыяту, да Савецкай улады, да рабочых і працоўных сялян. Беларускія нацыянал-дэмократы фактычна расчышчалі глебу, пракладвалі шлях да буржуазна-абшарніцкай, фашысцкай дыктатуры.

Крывавым тэрорам прыдушана Заходняя Беларусь. Пад падвойным— соцыяльным і нацыянальным уціскам стогнуць працоўныя масы Заходняй Беларусі. Контр-рэволюцыйныя беларускія нацыянал-дэмократы, у саюзе з сваімі заходня-беларускімі колегамі, беларускімі нацыянал-фашыстымі, агэнтамі польскай дэфэнзывы, рыхтавалі для Савецкай Беларусі долю окупаванай Заходняй Беларусі.

Маска з беларускага контррэволюцыйнага нацыянал-дэмократызму зьнята, сапраўдны варожы клясавы твар выяўлен. Працоўныя БССР, якія гэроічна змагаліся з царызмам, з нямецкімі і польскімі окупантамі, знойдуць сілы, каб зьмесьці на сьметнік гісторыі нікчэмны беларускі нацыянал-дэмократызм, разам з яго саюзьнікамі і абаронцамі.

Беларуская Асоцыяцыя пролетарскіх пісьменьнікаў, якая з першых дзён свайго заснаваньня вяла барацьбу з беларускім нацыянал-дэмократызмам, у адказ на контр-рэволюцыйныя замахі беларускіх нацыянал-дэмократаў, з большай актыўнасьцю і пасьлядоўнасьцю будзе:

творчасьцю і грамадзкай працай змагацца за генэральную лінію комуністычнай партыі;

высьвятляць перад працоўнымі масамі контр-рэволюцыйную сутнасьць беларускага нацыянал-дэмократызму, у якіх бы формах ён не выяўляўся; творчасьцю і працай узмацняць абароназдольнасьць нашай краіны;

больш нецярпіма адносіцца да нацыянал-дэмократычных хістаньняў у шэрагах БелАПП'у — да нацыянал-опортуністых-прымірэнцаў, гэтых фактычных агэнтаў контр-рэволюцыйнага нацыянал-дэмократызму ў сваіх радох: рашуча ачышчаць свае рады ад нацыянал-дэмократычных элемэнтаў і іх адкрытых ці замаскаваных прыхільнікаў;

выяўляць і забясьпечваць умовы разьвіцьця пачынаючым рабочым пісьменьнікам, уцягваць іх у свае шэрагі, яшчэ шырэй разгортваць заклік рабочых ударнікаў у літаратуру; організоўваць дзесяткі літаратурных гурткоў, студый, сэмінараў,—выхоўваць новыя кадры пролетарскай літаратуры;

яшчэ больш згуртоўваць свае шэрагі, наладжваць яшчэ больш цесную сувязь паміж БелАПП'ам і пролетарскай літаратурай СССР, а таксама рэволюцыйнай і пролетарскай літаратурай усяго сьвету, каб сваёй творчасьцю і працай служыць справе інтэрнацыянальнай солідарнасьці працоўных, справе іх супольнай барацьбы за сусьветны Кастрычнік.

Прэч контр-рэволюцыйны беларускі нацыянал-дэмократызм—агэнтуру заходняга імпэрыялістычнага фашызму!

Прэч опортуністых,—прымірэнцаў, падгалоскаў нацыянал-дэмократызму!

Няхай жыве КП(б)Б, правадыр працоўных Савецкай Беларусі!

Няхай жыве інтэрнацыянальнае адзінства працоўных усіх нацыянальнасьцяй і іх супольная барацьба супроць сваіх ворагаў, незалежна ад іх нацыянальнай афарбоўкі!

Няхай жыве беларуская пролетарская літаратура!

Няхай жыве АДПУ—слаўны вартаўнік Кастрычніцкіх заваёў!

Сакратарыят БелАПП'у: Я. Ліманоўскі, Р. Мурашка, П. Галавач, М. Лынькоў, Ів. Барашка, В. Сэрбанта, М. Мысьлінскі, Сенькевіч, Дунец.

Агульны сход Менскай Філіі БелАПП'у: А. Александровіч, Т. Шалай, А. Юдэльсон, Я. Гэльтманова, А. Дамэсак, Ян. Скрыган, Н. Вішнеўская, А. Звонак, М Хведаровіч, Ул. Хадыка, Ілі Харык, Я. Бронштэйн, І. Гурскі, М. Нікановіч, Паўлоўск, Я. Пфлаўмбам, Вітанзон, І. Плаўнік, С. Ліхадзіеўскі, З. Астапенка, В. Казлоўскі, М. Аляхновіч, С. Барноўскі, Ліфшыц, Ал. Кучар, С. Шушкевіч, Яўніо.

Бязьлітасная кара агэнтам інтэрвэнтаў—беларускім нацыянал-дэмократам

(З рэзолюцыі літаратурнага аб'яднаньня „Полымя“)

Мы вітаем баявы орган пролетарскай дыктатуры—ДПУ Беларусі, які своечасова выкрыў контррэволюцыйную дзейнасьць разьюшанага беларускага шовінізму—контррэволюцыйнага нацыянал-дэмократызму.

Нац-дэмаўская агентура працавала ў пісьменьніцкіх організацыях. Не абышлося без контррэволюцыйных вылазак паасобных пісьменьнікаў і ў літаратурнай організацыі „Полымя“. Аб гэтых яўна нацыянал-дэмократычных выступленьнях яскрава сьведчыць выкрытая партыйнай і савецкай грамадзкасьцю контррэволюцыйная сутнасьць „ліста трох пісьменьнікаў“ аб выхадзе з БДУ, контррэволюцыйны верш А. Дудара (тады-ж выключанага з „Полымя“), узьнятая Е. Слыбоцкім (Дударом) і падтрыманая Ц. Гартным і Зарэцкім тэатральная дыскусія, яўна нацыянал-дэмократычныя творы М. Зарэцкага „Падарожжа на новую зямлю“, раман „Крывічы“.

Ц. Гартны прызнаў свае політычныя памылкі. Ён прааналізаваў сваю творчасьць, свае публіцыстычныя артыкулы і перад шырокай савецкай грамадзкасьцю заявіў аб іх шкоднасьці. Зараз ён і ў прыватнай рабоце, пад кіраўніцтвам партколектыву заводу „Комунар“, імкнецца іх выправіць. Прызнае свае памылкі і М. Зарэцкі. Але організацыя „Полымя“ патрабуе ад М. Зарэцкага яшчэ больш рашуча, без усякіх хістаньняў выкрыць гэтыя памылкі перад рабочай клясай і савецкай грамадзкасьцю, Ц. Гартны і М. Зарэцкі прызналі і прызнаюць зараз, што іх такога роду літаратурная продукцыя зьяўлялася зброяй клясавага ворага, ворага савецкай улады і дыктатуры пролетарыяту, яны прызнаюць, што сваімі гэтымі творамі аб'ектыўна дапамагалі разгортваць дзейнасьць і ўзмацняць свае позыцыі беларускаму контррэволюцыйнаму нацыянал-дэмократызму.

Організацыя „Полымя“ не пазбаўлена была нац-дэмаўскай агэнтуры, якая хавала свой агідны твар, праводзячы здрадніцкую працу і гэтым самым накладаючы чорную пляму на ўсю організацыю. Нароўне са сваімі нац-дэмаўскімі правадырамі яны павінны адказваць перад пролетарыятам і працоўнымі. Ня месца агэнтам і паплечнікам нац-дэмаўшчыны ў радох пісьменьніцкіх організацый. Віна организацыі „Полымя“ ў тым, што яна своечасова не змагла выкрыць гэтых здраднікаў, гэтых былых людзей з цёмным мінулым, якія зашыліся ў рады пісьменьнікаў з тварылі свае цёмныя справы.

У далейшай сваёй працы організацыя „Полымя“ будзе пільна сачыць за чыстатою сваіх радоў ад клясавых ворагаў і за тым, каб творчая продукцыя кожнага члена організацыі служыла моцным аружжам у клясавай барацьбе з ворагамі дыктатуры пролетарыяту,

Організацыя „Полымя“ патрабуе самага суровага пакараньня контр-рэволюцыйнай групы беларускіх нацыянал-дэмократаў, якія вялі барацьбу супроць пролетарскай дзяржавы, супроць дыктатуры пролетарыяту

Мы, падпісваючы суровае асуджэньне контр-рэволюцыйнай групе беларускіх нацыянал-дэмократаў, патрабуючы жорсткага пакараньня ўдзельнікаў контр-рэволюцыі з усёй сваёй шчырасьцю і адданасьцю запэўняем комуністычную партыю, савецкую ўладу і ўсю пролетарскую грамадзкасьць, што будзем весьці бязьлітасную барацьбу з беларускім контр-рэволюцыйным нацыянал-дэмократызмам і шовінізмам, з праявамі якога-б там ні было колеру нацыянал-опортунізму, з рознымі ўхілістымі, з усімі элемэнтамі, варожымі да пролетарскай дыктатуры і заваёў Вялікага Кастрычніка.

Усе свае сілы, усю сваю здольнасьць і энтузіязм мы аддаем і аддамо ў сваёй савецкай грамадзкай працы і на фронце разьвіцьця пролетарскай літаратуры толькі рабочай клясе і яе кіраўніку—ленінскай комуністычнай партыі ў справе пасьпяховай пабудовы соцыялізму.

Мы заўжды гатовы ў зноўшнюю і рашучую бойку з ворагамі рабочае клясы і дыктатуры пролетарыяту, за канчатковую перамогу соцыялізму.

Бязьлітасная кара беларускім контррэволюцыйным нацыянал-дэмократам—саюзьнікам інтэрвэнтаў.

Няхай жыве дыктатура пролетарыяту!

З дэклярацыі Рак-Міхайлоўскага, Мятлы і Бурсэвіча

Сёньня мы друкуем вытрымку дэклярацыі былых паслоў у польскі сойм правадыроў Грамады Рак Міхайлоўскага, Мятлы і аднаго з актыўных працаўнікоў Грамады—Бурсэвіча. Усе яны прасядзелі ў турме па 3 з паловай гады і ў дэклярацыі выкрываюць манэўры фашысцкіх акупантаў. Дэклярацыя была зьмешчана ў замежным друку.

Да рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі Заходняй Беларусі

Таварышы!

Барацьба працы з капіталам, барацьба працоўных мас з буржуазіяй завастраецца чым далей, тым больш. Політычны і гаспадарчы крызіс, які цяпер перажываюць дзяржавы Эўропы і ўсяго сьвету, няўхільна вядзе працоўныя масы да перамогі над гнілым буржуазным ладам. Аднак-жа імпэрыялістыя не расстаюцца з думкай аб паходзе супроць СССР, падтрымліваючы паслухмяную імпанскую Польшчу ў яе імпэрыялістычных імкненьнях на Усход.

Гаспадарчы крызіс у самой Польшчы павялічваецца. Беспрацоўе расьце, непасільны падатковы цяжар даводзіць да роспачы сялянскія масы як беларускія і ўкраінскія, так і польскія.

Таварышы! Заходняя Беларусь, у выніку вайны захвачаная панскай Польшчай, ужо дзесяць год топчацца ботам окупанта. Окупанцкая ўлада стараецца катаваньнем арыштаваных і турмамі спыніць рэволюцыйны ўздым Заходня-Беларускіх працоўных мас. Аднак, гэта окупанцка-буржуазнай уладзе не ўдаецца. Беларускі нацыянальна вызваленчы рух расьце і паглыбляецца. Імкненьне працоўных мас Заходняй Беларусі да вызваленьня з-пад памешчыцка - буржуазнай польскай улады давяло ў свой час да стварэньня магутнай масавай організацыі Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады, якая аб'яднала ў сваіх радох каля 120 сьвядомых беларускіх сялян і работнікаў. Арышт паслоў Грамады і цэлых тысяч грамадаўцаў, нарэшце закрыцьцё Грамады—гэта знак слабасьці польска-буржуазнага ладу, гэта страх перад ростам рэволюцыйнага руху. Грамаду зачынілі, паслоў і правадыроў яе пасадзілі на доўгія гады за турэмныя краты, але рэволюцыйна-вызваленчы рух ніхто ліквідаваць ня здолеў і ня здолее.

Заўчаснае звальненьне пасьля трох з паловай гадоў катаргі трох паслоў і некаторых дзеячоў грамады, утварэньне двух-трох дзесяткаў польска-беларускіх пачатковых школ —вось яны панскія штучкі для абаламучаньня і дэзорыентаваньня мас.

Таварышы! Вызваляючы нас, урад спадзяваўся, як відаць, што мы, паеўшы па некальні год катаржнага хлеба, пойдзем на згоду з уладай, далучымся да выгоднай польскаму фашызму санацыйна-згодніцкай групы Луцкевіча, Астроўскага і К-о і гэтым адцягнем масы ад рэволюцыйнага нацыянальна-вызваленчага змаганьня. Але ўрад памыліўся: мы, члены Цэнтральнага Камітэту Грамады, засталіся нязломна вернымі сваёй сялянска-рабочай ідэолёгіі і зусім солідарызуемся з лістом старшыні Грамады т. Тарашкевіча, у якім ён выкрывае манэўры ўраду і ганьбуе беларускі фашызм. Праўда, адзін з часовых і выпадковых спадарожнікаў Грамады —Авінчыц—здрадзіў інтарэсам шырокіх працоўных мас. Далучыўся ён да буржуазна-кулацкае групы Луцкевіча, Астроўскага і К-о. Прэч здраднікаў, прэч ашуканства! Прэч саюзьнікаў і падпору фашыцкай окупацыі—групу Луцкевіча, Астроўскага, якая разам з нацыянал-дэмократамі ў БССР вядзе змаганьне супроць рабоча-сялянскай улады ў БССР,

Няхай жыве змаганьне працоўных мас Заходняй Беларусі супроць буржуазнай улады польскага окупанта. Няхай жыве непахісны саюз рабочых і сялян!

Сымон Рак-Міхайлоўскі, Пётра Мятла, Максім Бурсэвіч

Беласток.
15-X—30 г.

ДАМО У САВЕТЫ ЛЕПШЫХ УДАРНІКАУ

З 1-га сьнежня пачаліся перавыбары саветаў. Аднак, шэраг комсамольскіх організацый яшчэ стаяць у тылу справаздачна-перавыбарчай кампаніі, спадзяюцца на самацёк

„Комсамольцы і ўся рабоча-сялянская моладзь павінны прыняць актыўны ўдзел у справаздачна-перавыбарчай кампаніі саве[таў] стаць застрэльшчыкамі социялістычных мэтадаў яе правядзеньня. ЦК КП(б)Б ставіць перад комсамолам, як вернай зьмен[ай] бальшавіцкай партыі, задачу дапамагчы партыйным організацыям найбольш пасьпяхова правесьці выбары ў саветы" (З адозвы ЦК КП(б)Б)

А. ЧАРВЯКОЎ

Палітычныя задачы перавыбараў саветаў*)

Па БССР пачалася справаздачна-перавыбарчая кампанія саветаў.

Гэта кампанія мае вялізарнейшае палітычнае значэньне. Палітычным зьместам кампаніі павінны служыць усе вялізарныя задачы сучаснага пэрыоду, як разгорнутага пэрыоду социялістычнага наступленьня па ўсім фронце.

Далейшае ўзмацненьне кіруючай ролі комуністычнае партыі, як авангарду рабочае клясы ў барацьбе за социялізм, барацьба за генэральную лінію партыі, за індустрыялізацыю краіны і социялістычную рэконструкцыю сельскай гаспадаркі; барацьба за пяцігодку ў чатыры гады: уздым і організацыя новай хвалі бядняцка-серадняцкага сялянства ў колгасы і ліквідацыя кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі; разгортваньне культурнай рэволюцыі; высьвятленьне міжнароднага становішча Савецкага Саюзу ў сувязі з выкрытымі плянамі інтэрвэнцыі з боку міжнароднай буржуазіі і адбываючымся процэсам шкоднікаў—(„прампартыі")—агэнтуры інтэрвэнтаў; растлумачэньне мірнай палітыкі савецкай улады і ўсямернае ўзмацненьне абароназдольнасьці Савецкага Саюзу і баяздольнасьці Чырвонай арміі; высьвятленьне асноў ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі і рашучая барацьба супроць вялікадзяржаўнага расійскага шовінізму, як найбольш небясьпечнага на даным этапе, супроць беларускага нацыянал-дэмократызму—агэнтуры польскага фашызму і капіталістычнай інтэрвэнцыі; узмацненьне барацьбы на два фронты—супроць правага ўхілу, як найбольш небясьпечнага, супроць „левых" загібаў, супроць двурушніцтва, права-„лявацкага" блёку і прымірэнчых да іх адносін супроць рознавіднасьці опортунізму ва ўмовах нацыянальных рэспублік— нацыянал-опортунізму; узмацненьне савецкай дзяржавы, як дзяржавы дыктатуры пролетарыяту; узмацненьне сувязі ўсіх Саюзных Савецкіх Рэспублік у Саюзе ССР—вось тыя асноўныя пытаньні, навакол якіх трэба мобілізаваць увагу рабочае клясы, колгасьнікаў, бядняцка - серадняцкага сялянства і ўсіх працоўных Савецкай Беларусі ў часе перавыбарчай кампаніі.

Уся праца па перавыбарах саветаў павінна быць шчыльна зьвязана з вырашэньнем чарговых палітычна-гаспадарчых задач.

У выніку гэтага справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна ў яшчэ большай меры садзейнічаць мобілізацыі сіл рабочае клясы і ўсіх працоўных на выкананьне задач социялістычнага будаўніцтва і перамогу труднасьцяй росту. Далейшае разгортваньне соцспаборніцтва і ўдарніцтва, уздым увагі вакол пытаньняў сустрэчнага прамфінпляну і, на падставе гэтага, поўнае выкананьне прамфінпляну асобага кварталу; барацьба супроць прарываў у выкананьні плянаў загатовак ільну, бульбы і збожжа, мобілізацыі сродкаў насельніцтва; далейшае ўцягваньне ў колгасы бядняцка-серадняцкага сялянства і яшчэ больш рашучы паварот сельсаветаў тварам да колектывізацыі; праверка выкананьня плянаў па ўсеагульнаму навучаньню і г. д.—усё гэта павінна зьявіцца практычнымі вынікамі справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў.

Трэба, каб гэта справаздачна была падпарадкавана самай суровай пролетарскай крытыцы і самакрытыцы, каб, паказваючы дадатныя бакі працы саветаў, накіраваць агонь супроць праяў шкодніцтва, бюрократызму, опортунізму супроць усіх клясава-чужых элемэнтаў, якія прымазаліся да саветаў, каб ачысьціць саветы ад усіх варожых элемэнтаў.

Аднак, трэба „адрозьніваць самакрытыку ўнутры сыстэмы дыктатуры пролетарыяту ад крытыкі звонку. Клясаваму ворагу і яго агэнтуры ў нашых радох мы не дазволім сваёй крытыкай падмяняць нашу самакрытыку" („Правда").

Перавыбары саветаў будуць адбывацца ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Кулакі, нэпманы і інш. варожыя элемэнты будуць імкнуцца да таго, каб выкарыстаць перавыбарчую кампанію ў сваіх контр-рэволюцыйных мэтах, каб дыскрэдытаваць дзейнасьць і мерапрыемствы савецкай улады, каб адпарадкаваць свайму ўплыву несьвядомыя элемэнты, каб правесьці ў саветы сваіх агэнтаў, каб дэзорганізаваць работу саветаў. Вось гэта вымагае таго, каб партыйныя організацыі забясьпечылі моцнае бальшавіцкае кіраўніцтва перавыбарамі саветаў. Партыйныя організацыі ў часе кампаніі павінны ўзмацніць сваю пільнасьць, папярэджваючы і выпраўляючы найменшыя спробы працягнуць погляды правых і „левых" ухілістых і погляды права-„лявацкага" блёку, а таксама нацыянал-опортуністычныя погляды.

На ўсе найбольш слабыя вучасткі, праз якія імкнецца пралезьці наш клясавы вораг—трэба зараз-жа зьвярнуць увагу і зрабіць гэтыя вучасткі прыкладнымі ў барацьбе за социялізм (пастановы ЦВК аб мерапрыемствах па падрыхтоўцы працоўных жанчын да перавыбараў у саветы), правёўшы спэцыяльныя падрыхтоўчыя нарады, падрыхтаваўшы кандыдатуры і г. д.

Таксама важна выканаць дырэктывы аб увазе да перавыбараў у саветы сярод нацменшасьцяй. Трэба ў часе перавыбараў выкрыць самым шырокім масам працоўных буржуазную сутнасьць адзінства нацыянальнага фронту, мобілізаваць бядняцка-серадняцкую частку нацыянальнай вёскі да рашучага адпору кулацтву і яшчэ больш замацаваць інтэрнацыянальнае адзінства працоўных усіх нацыянальнасьцяй для барацьбы за социялізм.

Важнейшую організуючую ролю ў перавыбарчай кампаніі павінен адыграць друк. Друк павінен давесьці да ведама самых шырокіх мас працоўных нашы вялізарныя дасягненьні, растлумачыць програму далейшага социялістычнага будаўніцтва на аснове пастаноў XVI зьезду ЎсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б, выкрываць прарывы ў выкананьні чарговых задач і мобілізаваць масы на іх перамогу. Друк павінен шырока высьвятліць той вялізарны ўздым энтузіязму рабочае клясы і ўсіх працоўных, якім яны адказалі на контррэволюцыйнае шкодніцтва і хітрыкі імпэрыялістых.

Пролетарскі горад павінен прыйсьці на дапамогу вёсцы. Гэта вымагаецца асабліва тым, што гэтыя перавыбары ўпяршыню будуць адбывацца пасьля пераходу на раённую сыстэму кіраўніцтва. Шэфскія таварыствы, паасобныя брыгады па перавыбарах павінны накіроўвацца ў раён, сельсавет, вёску.

Апіраючыся на социялістычнае асяродзішча вёскі—саўгас, прамысловае прадпрыемства, колгас—неабходна разгарнуць шырокім фронтам наступленьне на капіталістычныя элемэнты.

Трэба дамагацца, каб у выніку перавыбараў значна палепшыць клясавы склад саветаў: рабочы-ўдарнік, колгасьнік і лепшыя прадстаўнікі бядняцка-серадняцкага сялянства клясававытрыманыя і адданыя партыі і савецкай уладзе павінны ўвайсьці ў склад саветаў.

Гэта замацуе саветы, як органы дыктатуры пролетарыяту, зробіць іх яшчэ больш баяздольнымі ў барацьбе за генэральную лінію партыі, у барацьбе за поўнае выкарчоўваньне капіталістычных карэньняў у нашай краіне, у барацьбе за социялізм.

*) Друкуецца ў скарочаным выглядзе.

M. Югаў

Вялікадзяржаўная контрабанда пад сьцягам беларускага нацыяналізму

(Канец. Пачатак гл. у № 277 і 278)

Больш цікава другое. Здавалася-б, шчыры нацыянал - дэмократ павінен быў-бы адкінуць нагой гэту „тэорыю"—анты-нацыяналяную і анты-дэмократычную, якая хоча парадніць нацыянал-дэмократычны рух з расійскім царызмам. Але ў сапраўднасьці нацыянал-дэмократы ня толькі не пярэчаць супроць гэтых концэпцый, але садзейнічаюць іх пашырэньню. І гэта невыпадкова.

Гіганцкі прэс социялістычнай рэконструкцыі ўсяе гаспадаркі, у прыватнасьці сельскае гаспадаркі, буйнейшыя социяльныя зрухі, зьвязаныя з гэтым процэсам, адкінулі і ранейшых расійскіх кадэтаў, акцябрыстых, чорнасоценцаў з беларусаў і беларускіх нацыянал-дэмократаў да адной сілы, якая зьяўляецца адзінай сур'ёзнай клясавай сілай унутры краіны, на якую могуць абаперціся ворагі пролетарыяту—да кулацтва. Дыялектыка клясавага змаганьня знайшла свой выраз у практычным і палітычным зрошчваньні і буржуазна-нацыяналістычных беларускіх груп, у мінулым цесна зьвязаных з царызмам, і буржуазных нацыянал-дэмократычных груп, якія ў мінулым зьяўляліся працаўнікам царызму. Гэта зрошчваньне абедзьвюх груп, якое адбылося на грунце барацьбы з галоўным іх ворагам — пролетарскай рэволюцыяй — і знайшло свой літаратурны выраз у нацыянал-фашысцкай рабоце Цьвікевіча. Абвінавачаньні бальшавікоў—беларусаў у тым, што яны і ў цяперашні час захоўваюць за пазухай „западно-уусские" каменьні, сумяшчаецца з узьвядзеньнем на нацыянал–вызваленчы п'едэстал тэй-жа самай колёнізатарскай і чорнасоценнай ідэолёгіі „западно-руссизм". Гэтыя ўзаемна-выключаючыя, як быццам-бы, рэчы на самай справе служаць аднаму—змаганьню з савецкай, бальшавіцкай Беларусьсю.

Такава „ідэя" гэтай кнігі. У гэтай кнізе лепш, чым у якім-бы там ні было іншым творы, за маскай нацыяналізму можна ўбачыць твар ашалелага, разьюшанага, зьнішчаемага кулака, можна ўбачыць перапляценьне вялікадзяржаўнага шовінізму з мясцовым шовінізмам—з беларускім нацыянал-дэмократызмам.

15 комсамольцаў—на працу ў сельсаветы

Бюро Вушацкага райкому БСМ, разгледзеўшы пытаньне аб задачах комсамолу ў праводзімай справаздачна-перавыбарчай кампаніі сельсаветаў, намеціла шэраг практычных мерапрыемстваў удзелу комсамольскай організацыі ў гэтай палітычнай кампаніі.

Райкомам намечана па ўсіх сельсаветах і вёсках правесьці сходы батрацка-бядняцкай і колгаснай моладзі, на якіх заслухаць справаздачы комсамольцаў, членаў сельсаветаў аб іх працы, адначасова абгаварыць кандыдатуры з моладзі ў новы склад саветаў. Разам з гэт[ым] бюро райкому пастанавіла мобі[лізa]ваць 15 лепшых комсамольца[ў] батракоў, беднякоў і колгась[нікаў] на сталую працу ў сельсаве[ты] ячэйкам прапанавана скончыць мобілізацыю да 1 сьнежня.

Ва ўсіх ячэйках раёну ўжо пачалася праца па правядзе[ньні] сходаў моладзі і мобілізацыі 15 [ком]самольцаў. Да перавыбараў [ў]цягнута і піонэрская організа[цыя]. Піонэры і школьнікі пачалі [ма]ваць лёзунгі і выпісваць позвы [вы]баршчыкам.

Гінзбур[г]

Любаньскае Райпрофбюро не мобілізавалася

Справаздачна-перавыбарчая кампанія па Любаньскім раёне ўжо распачата. Але профсаюзныя організацыі ніякага ўдзелу ў ёй ня прымаюць. 28 лістапада ў мястэчку праводзіўся сход членаў профсаюзу, на якім абгаварвалася пытаньне аб задачах профсаюзу ў перавыбарчай кампаніі саветаў, але на гэты сход зьявілася толькі 35 проц. членаў профсаюзу. Адначасова нельга не адзначыць і таго, што калі пачаўся запіс у брыгады па дапамозе саветам у правядзеньні перавыбараў дык члены профсаюзу, за выключэньнем настаўнікаў, лічылі патрэбным запісвацца ў бры[гады].

Усё гэта зьяўляецца ні чым [ін]шым, як вынікам дрэннага кі[раў]ніцтва з боку райпрофбюро і [раў]кому, якія не дааценілі вялі[кага] палітычнага значэньня справа[здачн]а-перавыбарчай кампаніі саве[таў], не мобілізавалі ўвагі членаў пр[оф]саюзу для практычнага ўдзелу.

Райпрофбюро павінна зара[з] ўзмацніць сваё кіраўніцтва, [лікві]даваць прарывы ў сваёй пра[цы па] ўдзелу ў справаздачна-перавы[бар]чай кампаніі саветаў.

Ко[...]

Нам пішуць

Як рыхтуюцца комсамольскія ячэйкі да перавыбараў саветаў

Комсамольская ячэйка м. Старыя-Дарогі не праводзіць ніякай падрыхтоўчай работы да перавыбараў саветаў. Вакол пытаньня перавыбараў саветаў ня складзена патрэбная грамадзкая думка і не праведзена ніякай работы сярод выбаршчыкаў.

П. Х.

* * *

Вучні Дукорскай сямігодкі імя 16 парцізан (комсамольская ячэйка), разгарнулі шырокую масавую падрыхтоўку да перавыбараў саветаў. Вучні старэйшых клясаў падзелены на асобныя брыгады, якія прымацаваны да перавыбарчых пунктаў для вядзеньня падрыхтоўча-растлумачальнай працы сярод насельніцтва. Складзеныя брыгады ўжо распачалі сваю практычную працу. Па ўсіх пунктах, да якіх прымацованы брыгады, праведзены гутаркі аб задачах перавыбараў, прапрац[авана] інструкцыя, праводзіцца чытк[а] вэт, а таксама рыхтуюцца нас[цен]газэты.

Адначасова вучні ўзялі на [сябе] абавязак выпісаць позвы вы[бар]шчыкам, разьнесьці іх і забя[сьпе]чыць 100 проц. яўку на пер[авы]барчыя сходы жанчын. Піонэ[ры] вучні школы організавалі бры[гады] якія будуць аставацца дома з [дзець]мі.

Б. [...]

* * *

Драчкоўская ячэйка (Сьміл[авіцкі] раён) па-ўдарнаму рыхтуецц[а да] перавыбараў саветаў. Па ўсі[х на]селеных пунктах ячэйка пр[авяла] сходы моладзі, на якіх прапр[аца]вала пытаньне „задачы пера[выба]раў саветаў і ўдзел моладзі". А[дна]часова ячэйка намеціла ў пер[шых] лічбах сьнежня склікаць сельс[авец]кую конфэрэнцыю моладзі, на [якую] ўжо абрана 60 чалавек колга[снай] бядняцка-батрацкай і серадн[яцкай] моладзі. Ячэйка вядзе рашучу[ю ба]рацьбу з кулацкімі спробамі [пра]весьці сваіх кандыдатаў у [склад] саветаў, дапамагаючы сельса[вету] у выяўленьні пазбаўленых вы[бар]чых правоў і складаньні с[пісаў] выбаршчыкаў.

Янкаве[...]

* * *

У Пераджарскім сельсавеце, С[...]лаўскага раёну, да перавыб[араў] сельсаветаў не праводзіцца ні[якай] падрыхтоўкі. Інструкцыя аб [пера]выбарах сельсавету не прапра[цавана] на сярод насельніцтва, сход[аў ба]трацтва і беднаты ніхто не пр[авя]дзіў.

Партыйна-комсамольскія яч[эйкі] не зьвяртаюць патрэбнай ува[гі на] правядзеньне гэтай важнейшай [па]літычнай кампаніі.

Б. А[...]

Самацёк не зьнішча[ны]

На вёсцы Караваева, Рудзенс[кага] сельсавету ліквідацыя няпісь[мен]насьці знаходзіцца ў заняпадзе.

Лікпункты забясьпечаны с[шыт]камі ды іншымі прыладамі, справа ідзе самацёкам. Комсамо[ль]ская ячэйка вёскі стаіць у бак[у ад] гэтай справы

М. Піску[...]

ПАЧАЦЬ ПАДРЫХТОУКУ ДА АСЕНЬНЯЙ СЯУБЫ

Організаваць сустрэчныя пляны конкрэтных дзеяньняў комсамолу

25-га лістапада колегія Наркамзему БССР зацьвердзіла плян вясеньняй сяўбы на 1931 год. 27 лістапада гэты плян разглядаў прэзыдыум Дзяржпляну і СНК БССР.

Нашы посьпехі ў справе колгаснага будаўніцтва далі поўную магчымасьць на другую бальшавіцкую вясну—вясну 1931 году паставіць яшчэ больш вялікія задачы, чым тыя, якія стаялі перад першай бальшавіцкай вясной 1930 г. Згодна пляну колегіі Наркомзему і сустрэчных плянаў непасрэдна з раёнаў, пасеўная плошча БССР павінна павялічыцца на 17,2 проц. супроць мінулага году і будзе складаць—2675000 га пахаці. Колгасы займуць звыш 30 пр. усёй плошчы пахаці.

Згодна меркаваньням НКЗ БССР усім раёнам вызначаны вядучыя галіны гаспадаркі з упорам на павялічэньне разьвіцьця тэхнічных культур і жывёлагадоўлі. Па БССР вызначана 36 ільнаводных раёнаў, 7—садова-гародных і 57 жывёлагадоўчых. Ільнаводныя раёны павінны павялічыць пасеўную плошчу ільну з 133000 (па даных ЦСУ) да 240000 га, у гэтых-жа раёнах пасеў бульбы павялічыцца з 516000 га да 650000 га.

Стада кароў у жывёлаводчых раёнах павялічыцца з 1168300 галоў да 1234500 галоў. Стада сьвіней павялічыцца з 1658700 галоў да 2448100 галоў.

Плошча пад караньплодамі павялічыцца з 18000 га да 80000 га. Плошча сілосных культур—з 1800 га да 35500 га.

Для забясьпечаньня пролетарскіх цэнтраў гароднінай плошча гароду павялічваецца з 45000 га да 70000 га. А таксама плошча аднагадовых траў павялічыцца з 50000 га да 85000 га.

Вышэйпрыведзеныя лічбы з усей красамоўнасьцю гавораць аб тэй вялізарнасьці задачы, якая стаіць перад другой бальшавіцкай вясной.

Пасьпяховае выкананьне гэтых задач будзе залежаць выключна ад таго, наколькі будзе мобілізавана ўся працоўная грамадзкасьць на практычны ўдзел і рэалізацыю гэтага пляну. Комсамол, як і раней павінен прыняць асабліва актыўны ўдзел у выкананьні плянаў вясеньняй сяўбы, распачаўшы зараз-жа шырокую масавую працу, павінен мобілізаваць усе сілы на шырокую прапрацоўку плянаў вясеньняй сяўбы, даводзячы іх да сельсавету, колгасу, саўгасу і аднаасобных гаспадарак, організаваць сустрэчныя опэрацыйныя пляны конкрэтных дзеяньняў комсамолу, комсамол павінен дабіцца выкананьня і перавыкананьня як колгасных так і якасных паказчыкаў пляну вясеньняй пасеўнай кампаніі.

На X зьезд ЛКСМБ вясковая комсамольская організацыя павінна прыйсьці з плянам конкрэтных дзеяньняў на 3-ці год пяцігодкі.

Б. Фрыд.

ДАБІЦЬ РАСХЛЯБАНАСЬЦЬ І БЕЗАДКАЗНАСЬЦЬ!

Зьнішчыць „чахарду“ ў вылучэньні піонэр-працаўнікоў

Раз агляд створым рашучы пералом у рабоце піонэр-арганізацыі і яшчэ больш мобілізуем яе на штодзённы актыўны ўдзел у выкананьні конкрэтных задач соцыялістычнага будаўніцтва

Ажыцьцяўляем рашучы паварот

(З пасяджэньня ЦБ ДКО)

Дырэктару патрэбна пісулька

Гомель. Зараз комсамольскія ячэйкі паказалі добрыя прыклады работы, напрыклад, ячэйкі „Прогрэс“, „Палесдрук“. З базы пачалі непасрэдна працаваць на заводзе. Піонэры фабрыкі „Праца“ удзельнічаюць у ліквідацыі прарыву. Піонэры замяняюць 6 рабочых. База фабрыкі „Вэзуві“ таксама распачала працу. Піонэры працуюць у выхадныя і вольныя ад заняткаў дні. База Жылсаюзу стварыла ўдарныя батальёны, і піонэры дапамагаюць рабочым выконваць будаўнічы плян. Дырэктар фабрыкі перашкаджае ў працы піонэрам. На швэйнай фабрыцы дырэктар сказаў, што „без піонэраў завод лепш будзе выконваць свой промфінплян“ і не дазволіў пастаўпатруляў з ліку піонэраў. Ён заявіў: „пакуль не атрымаю спэцыяльнай дырэктывы ад ЦК партыі, піонэрскай работай займацца ня буду“.

Былі выпадкі, калі дырэкцыя выгнала прышоўшых на працу піонэраў. Сколькі ні спрачаліся, нічога не маглі дабіцца. Нарэшце згадзіліся пускаць піонэраў толькі ў адзін цэх.

Піонэры без кіраўніцтва

Смалявічы. Сыстэматычнай працы за выключэньнем кампаній, піонэратрады не праводзілі. За апошні час ячэйкі не кіравалі работай піонэратрадаў. Пасьля баявога агляду справа кіраўніцтва палепшылася. Праведзеньне баявога агляду не мобілізавана грамадзкасьць. У местачковых атрадах справа нагладжана лепш, бо яны больш удзельнічаюць у соцбудаўніцтве. Піонэры зьбіралі ўтыль-сыравіну, працавалі ў колгасах, высьвятлялі ў друку. Таксама рашылі правесьці нараду павадыроў разам з кіраўнічымі павадырамі, дзе паставіць пытаньне аб выкананьні дзяржаўнага заданьня па політэхнізацыі.

Профсаюзы ўсё яшчэ ў баку

Клімавічы (Грышчанка). Недахопам нашай працы ў час баявога агляду было тое, што не ўдалося склікаць пленуму райкому. Правялі гарадзкі актыў, нараду, дзе было пастаўлена пытаньне аб баявым аглядзе і становішчы піонэрорганізацыі. Для практычнай дапамогі атрадам у працы былі вылучаны комсамольцы брыгадзірамі ў раён. Нам удалося ўскалыхнуць ячэйкі і павярнуць іх да практычнай работы з піонэрорганізацыяй, чаго ня было раней. На гарадзкіх актывах, якія зьбіраліся па некалькі разоў, вызначалі мерапрыемствы для гарадзкіх атрадаў і ў выніку гэтага многія гарадзкія атрады бяруць шэфства над вясковымі, пасылаюць брыгадзіраў для дапамогі ў працы раённым вясковым атрадам.

Патрэбнай увагі з боку профсаюзаў і іншых грамадзкіх організацый няма.

Праводзім вытворчыя манэўры

Фрунзэўскі раён (Плашчынскі) піонэры базы мэталістых прымалі ўдзел у вытворчым жыцьці заводу, выяўлялі прагульшчыкаў і вербавалі ўдарнікаў, давалі свае парады і г. д. База будаўнікоў разьбіта на вытворчасьці. Там піонэры ўстанавілі дзяжурствы для выяўленьня прагульшчыкаў і лжэ-ударнікаў, правяралі як выконваюцца рабочыя прапановы, вывесілі скрынку для збору рабочых прапаноў. Але ёсьць і такія атрады, якія яшчэ да работы не прыступілі, як, напрыклад, адтрад Менбуду. Райбюро намячае правесьці вытворчыя манэўры з мэтаю ўскалыхнуць комсамольскія і піонэрскія організацыі. Вытворчыя манэўры правядзем па 4 маршрутах: 1. Барацьба піонэрорганізацыі за выкананьне прамфінпляну, 2. Нацыянальна культурнае будаўніцтва, 3. Вайскова-фізкультурная работа.

Райком належнай увагі баявому агляду не аддаў.

Піонэры організоўваюць ударныя брыгады

Васковіч (Барысаў).

Некаторыя атрады ужо ўступілі ў вытворчыя манэўры. На заводзе „Комінтэрн“ было закантрактована сіламі піонэраў да канца пяцігодкі 20 рабочых. Піонэры Домбаля ўзяліся за організацыю новых ударных брыгад да комсамольскага зьезду. Але вытворчыя манэўры організаваліся па ініцыятыве школьнікаў. Піонэрорганізацыя базы заводу „Комінтэрн“ дала добрыя вынікі працы. Піонэры ў вытворчых манэўрах удзельнічаюць як школьнікі,—ня відаць піонэрскага твару.

Вынік абураючай безадказнасьці

З 42-х атрадаў Петрыкаўскай піонэорганізацыі, існаваўшых раней, цяпер засталося толькі 18, ды і тых не адчуваецца.

На заводзе „Зьвязда“ (Капцэвічы)—2 атрады, але ніякага ўдзелу ў вытворчасьці яны ня прымаюць. На заводзе адчуваецца недахоп рабочай сілы. Піонэры старэйшага ўзросту маглі-б палегчыць гэтае цяжкое становішча, дапамагаючы прыбіраць ад станкоў, падносіць неабходныя матар'ялы. Прамфінплян выкананы толькі на 84,4 проц. Піонэратрады ня ўключыліся сумесна з комсамольскім і партыйным колектывам у паход за ліквідацыю прарыву.

Шклярнік ня ведае.

К такому стану атрады прышлі дзякуючы таму, што павадыр базы т. Шклярнік (комсамолка, член партыі) зусім не кіравала імі. За апошнія некалькі месяцаў ня было ніводнага збору атрадаў.

На пытаньне брыгады аб колькасьці атрадаў, Шклярнік адказвае: „Ня ведаю. Я падала заяву, каб штаб зьняў мяне з гэтай працы“.

Бюро партколектыву і РК ЛКСМБ павінна тэрмінова разглядзець гэта пытаньне. Шклярнік павінна быць зьнята з працы і прыцягнута да суровай адказнасьці за тое, што давяла атрады да такога стану.

Яшчэ горш становішча атрадаў па вёсках Петрыкаўскага раёну. Брыгадзірам, якія выехалі ў вясковыя атрады праводзіць баявы агляд, прыходзілася ўсюды нанова організоўваць раней існаваўшыя атрады.

У большасьці выпадкаў важатыя малы знаёмы з піонэррухам, а то і проста ня хочуць працаваць з піонэрамі.

За—капеечку

Некалькі слоў аб райбюро ДКО

Былы старшыня РБ ДКО—т. Віленскі, які кіраваў апошнія 4 месяцы, больш цікавіўся тым, каб зарабіць як найболей грошай. Ён узяў на сябе кіраўніцтва фарпостамі 3-х Петрыкаўскіх сямігодак, але-ж нічога не зрабіў, каб наладзіць там работу.

Бюро зрабіла вялікую памылку, перавёўшы Віленскага Апоргам РК. Ня гледзячы на тое, што політвучоба ў ячэйках не наладжана, 5-XI Віленскі адпрасіўся на два дні на сьвята Кастрычніка, а зьявіўся толькі 13-XI. Бюро РК КП(б)Б абмежавалася тым, што зьняла яго з гэтай працы і паслала на іншую.

Райкомаўская пашана абібоку

Бюро РК ЛКСМБ на сваім пасяджэньні разабрала справу Віленскага і вынесла яму... таварыскую заўвагу. Гэта—пакараньне за 4-х месячную бязьдзейнасьць, за развал піонэр-організацыі. Гэта—у той час, як ён ужо мае суровую вымову за растрату, будучы загадчыкам піонэрскім клюбам у Мазыры.

Віленскі павінен панесьці пакараньне за тое становішча піонэрорганізацыі, у якім яна апынулася дзякуючы яго кіраўніцтву.

Брыгадзір ЦП ДКО—**Мушкін.**

Баявыя тэмпы баявой праверкі

Комсамольская ячэйка пры сямігодцы (Бягомльскі раён) уключылася ў баявую праверку піонэрскай організацыі.

У гэты-ж дзень яна сабрала агульны сход комсамолу з удзелам настаўніцтва і вучняў, і з вялікім энтузіязмам вырашыла гэта пытаньне.

У сваёй пастанове ячэйка комсамолу адзначыла: пад сьцягам ударніцтва і соцспаборніцтва з другімі ячэйкамі дабіцца карэннага пералому працы піонэрорганізацыі свайго і местачковага атрадаў ЮП на новы мэтад, дзеля чаго давесьці мэты баявой праверкі піонэрорганізацыі да кожнага піонэра, вучня і іх бацькоў. Пасьля гэтага вывесіць скрынку для прапаноў па палепшаньню працы ў галіне конкрэтнага ўдзелу піонэрскай організацыі ў будаўніцтве соцыялізму. Для дапамогі РК комсамолу ў раённай праверцы піонэрорганізацыі вылучыць 3 комсамольцаў.

Атрад ЮП пры сямігодцы і местачковы атрад ЮП стаў на новыя рэйкі працы.

Вось некаторыя прапановы з нашай скрынкі:

1. Піонэрскаму атраду са школай цесна ўвязацца з працай колгасу, склаўшы з ім соцумову па розных пытаньнях, як, напр.: аб конкрэтнай дапамозе колгасу ў час уборачнай і вясеньняй пасеўнай кампаніі, аб лепшых узорах працы на гародзе, адвёўшы піонэрскую градку сярод колгаснай, аб лепшым доглядзе жывёлы, асабліва сьвіней, узяўшы над імі шэфства, і на шэрагу іншых пытаньняў.

2. У час перавыбараў сельсаветаў піонэрам організаваць двухдзенныя ясьлі для дзяцей, маткі якіх павінны ўдзельнічаць у перавыбарах саветаў.

3. Вывучыць піонэратрадам сельскай гаспадарчыя машыны.

4. На тэрыторыі дзейнасьці атрадаў ЮП дасканала праверыць, ці ўсе батрацка-бядняцкія масы дзяцей ахоплены школай. **Славікоўскі.**

Якое кіраўніцтва, такія і посьпехі

Клічаўская піонэрорганізацыя ўключылася ў баявы агляд ДКО яшчэ з 10 лістапада. Агляд працы трох местачковых атрадаў Клічава паказаў наступнае: атрады ня маюць сталых піонэрпавадыроў, ячэйка комсамолу да гэтага часу ня цікавілася выхаваньнем маладога пакаленьня і ня ўнікала ў піонэрпрацу. З боку РБ ДКО ня было кіраўніцтва.

Час ужо ўзяцца за працу сярод піонэрскай організацыі як комсамольскай ячэйцы, так і РБ ДКО.

Эм. Эс.

Агляд дае станоўчыя вынікі

У Чачэрскім раёне пасьля баявога агляду праца піонэратрадаў значна палепшылася. Раней было 25 атрадаў з 1002 чал., пасьля баявога агляду налічваецца 36 атрадаў з 1397 чалавек.

Для большага ўзмацненьня працы піонэрорганізацыі організаваны 2-хтыднёвыя курсы па падрыхтоўцы піонэрпрацаўнікоў. Райпрофбюро для піонэркурсаў адпускае 200 руб. **Струмень.**

Ня цікавяцца піонэрамі

Пры колгасе „Бальшавік“, Крываносаўскага сельсавету, Стара-Дарожскага раёну, піонэратрад раскідаўся.

Ячэйка КСМ зусім не кіравала атрадам і ўсё лета ён не працаваў. Павадыр атраду т. Беляновіч М. працай не зацікаўлена.

Л. Дубовы.

Бяз руля

У вёсках Букча, Радылавічы, Хачэнь, у беларускай сямігодцы мястэчку Турава ўжо 3 месяцы, як піонэратрады бязьдзейнічаюць. Ва ўсіх атрадах няма пляну работы. Організацыя не аформлена, атрады не разьбіты на зьвеньні, няма павадыроў і нампавадыроў зьвеньняў. Комсамольскія ячэйкі ня цікавяцца працай атрадаў. У мястэчку Турава ў яўрэйскай сямігодцы маюцца атрады. Пры атрадах ня было павадыроў да пачатку навучальнага году. Цэлае лета атрады ня мелі кіраўніцтва, працавалі па ініцыятыве саміх піонэраў. І толькі ў пачатку навучальнага году, па намаганьню піонэраў, быў вылучан адзін павадыр на два атрады.

Другога павадыра і дагэтуль не маюць. Комсамольская ячэйка адказвае, што няма комсамольцаў, якія маглі-б быць павадырамі. У мястэчку Маляшава піонэр-атрадам кіраваў увесь час беспартыйны і толькі 9-XI—30 г. ён быў зацьверджан райкомам КСМ. Райбюро ўжо два месяцы не працуе. Па атрадах ніякія дырэктывы не даюцца. Пасьля раённай конфэрэнцыі комсамолу толькі адзін раз было склікана раённае бюро. Вучот пры РБ ДКО не наладжан,—старшыня райбюро ня ведае колькі і дзе знаходзіцца атрадаў.

Піонэрская організацыя Тураўскага раёну ў надзвычайна цяжкім стане. Комсамольскай організацыі Турава трэба зараз-жа павярнуцца тварам да піонэрорганізацыі, даць кіраўніцтва і дапамогу ў штодзённай яе працы па рэалізацыі дзяржаўнага заданьня.

Трэба яшчэ адзначыць, што баявы агляд не праходзіць так, як павінен быў праходзіць. Комсамольскія ячэйкі яшчэ не павярнуліся тварам да агляду піонэрорганізацыі. РК ЛКСМБ па сёньнешні дзень не разаслаў па ячэйках дырэктывы наконт баявога агляду.

Брыгадзір—**Фрыдман Д. М.**

— Ты не жадаеш ехаць на раён!

У Клімавіцкім раёне баявы агляд організацыі Ю. П. зрываецца. Старшыню РБ ДКА па загаду РК КП(б)Б зрабілі з 28-XI—30 г. упаўнаважаным у адным з сельсаветаў па падрыхтоўцы і правядзеньню справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў, а разам з гэтым і па падгульваньню ўсіх бягучых гаспадарча-політычных кампаній.

Спроба старшыні РБ ДКА аслабаніцца ад гэтай працы, у зьвязку з баявым аглядам піонэрскай організацыі, расцэнена сэкрататом райкому комсамолу як нежаданьне ехаць на раён. **Грашчанка.**

Пастанова ЦК і ЦКК УсеКП(б)

аб фракцыйнай рабоце Сырцова, Ломінадзэ і іншых

1. Заслухаўшы паведамленьне Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі аб фракцыйнай антыпартыйнай рабоце Сырцова, Шацкіна і іншых тлумачэньні апошніх ЦК і ЦКК устанаўляюць, што:

а) тав. Сырцоў організаваў падпольную антыпартыйную групу, у кіруючае ядро якое ўваходзілі Нусінаў, Каўрайскі, Гальпэрын, Курс і іншыя;

б) тав. Ламінадзэ стаяў на чале існаваўшай на працягу значнага часу фракцыйнай антыпартыйнай групы, у кіруючае ядро якое ўваххозілі Шацкін, Разьнік і іншыя;

в) гэтыя фракцыйныя падпольныя групы організавалі „лева“-правы блёк на аснове агульнай політычнай пляцформы, супадаючай ва ўсім асноўным з пляцформай правых опортуністых;

г) гэта пляцформа, навеяная панікай перад труднасьцямі і жаданьнем паспэкуляваць на іх, патрабуе, па сутнасьці справы, адмовы ад бальшавіцкіх тэмпаў будаўніцтва і абвяшчае неабходнасьць „звужэньня фронту капітальнага будаўніцтва“ (Ламінадзэ),

д) для апраўданьня сваёй опортуністычнай пляцформы т. т. Сырцоў, Ламінадзэ і іншыя ўжывалі такія чыста меншавіцкія, груба-паклёпніцкія прыёмы барацьбы з партыйным і савецкім кіраўніцтвам, як абвяшчэньне посьпехаў нашага будаўніцтва „очковтирательством“ (Сырцоў), абвяшчэньне Сталінградзкага трактарнага заводу „Пацёмкінскай вёскай“ (Сырцоў), сьцьвярджэньне аб тым, што ў савецкім апараце Закаўказьзя „пануюць панска-фэодальныя адносіны да патрэб і інтарэсаў рабочых і сялян“ (Ламінадзэ) і г. д.;

е) абедзьве групы дапускалі ў сваёй фракцыйнай рабоце расконсьпіраваньне сакрэтных пастаноў партыі;

ж) тав. Сырцоў, як і тав. Ламінадзэ і Шацкін праводзілі ў сваіх адносінах да партыйнага кіраўніцтва двурушніцтва і ашуканства партыі, а пры апытаньні ў ЦКК давалі заведама няправільныя паказаньні,

2, ЦК і ЦКК устанаўляюць далей, што тым самым т. т. Сырцоў, Ламінадзэ, Шацкін і іншыя парушылі:

а) пастанову X зьезду партыі аб адзінстве, а іменна:

„каб ажыцьцявіць суровую дысцыпліну ўнутры партыі і дабіцца найбольшага адзінства пры адхіленьні ўсякай фракцыйнасьці, зьезд дае ЦК паўнамоцтвы ўжываць у выпадках парушэньня дысцыпліны ці аджываньня, або дапушчэньня фракцыйнасьці, усе меры партыйных спагнаньняў аж да выключэньня з партыі, а ў адносінах да членаў ЦК—перавод іх у кандыдаты і нават, як крайнюю меру, выключэньне з партыі“;

б) пастанову аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК у красавіку 1929 г., а іменна:

„устанавіць спэцыяльныя меры, аж да выключэньня з ЦК і з партыі, якія могуць гарантаваць сакрэтнасьць пастаноў ЦК і Політбюро ЦК“;

в) пастанову XV зьезду партыі, а іменна:

„члены партыі, якік адмаўляюцца праўдзіва адказваць на запытаньні кантрольных камісій, падлягаюць неадкладнаму выключэньня з партыі“.

3. На падставе ўсіх гэтых фактаў ЦК і ЦКК пастанаўляюць:

а) т. т. Сырцова і Ламінадзэ выключыць са складу ЦК УсеКП(б);

б) тав. Шацкіна выключыць са складу ЦКК УсеКП(б).

Справа „Прамысловай партыі“

ЗАЛІЦЬ КРАІНУ КРЫВЁЮ,

ЗАПРУДЗІЦЬ ЯЕ ЭКСПЛЁАТАТАРАМ',-- ВОСЬ ЗА ШТО ЗМАГАЛІСЯ РАМЗІНЫ І ЛЁСІКІ

Рэвалюцыйная пільнасьць пролетарыяту выкрыла пляны шкоднікаў

Працоўныя СССР на дзейнасьць контр-рэволюцыянэраў адказваюць узмацненьнем абароназдольнасьці краіны, выкананьнем і перавыкананьнем плянаў социялістычнага будаўніцтва

Практычны курс шкодніцтва

Суд пераходзіць да высьвятленьня практычных спосабаў і шляхоў шкодніцтва за пэрыод з пачатку 1927 году да канца бягучага году.

У забясьпечаньні апалам намаганьні шкоднікаў былі накіраваны да таго, каб п стаянна трымаць гэту важнейшую галіну народнае гаспадаркі ў стане крайняй напружанасьці, якая лёгка магла-б перайсьці ў катастрафічную, у выпадку адкрыцьця ваенных дзеяньняў.

З гэтай мэтай у вугляздабываючай прамысловасьці шкоднікі ўсімі мерамі дабіваліся затрыманьня дасьледчых работ і жыльлёвага будаўніцтва.

Вельмі яскравым довадам посьпехаў, якіх удавалася дасягнуць „прампартыі“ сваёй упартай барацьбой за мінімальныя тэмпы, зьяўляецца іх шкодніцкая пяцігодка па торфараспрацоўцы. Шкодніцкая пяцігодка запрэктавала здабычу торфу за апошні год пяцігодкі ў 15 млн тон. Праўда, ажыцьцявіцца гэтаму пляну ня было суджана. Ён па прызнаньні самога Рамзіна быў зьмецены магутнай хваляй энтузіязму рабочых, якія ў парадку сустрэчных прамфінплянаў зьнізу разьбілі махінацыі шкоднікаў, давёўшы плян здабычы да 33 мільёнаў тон, г. зн. павысілі тэмп здабычы больш, чым у два разы параўнальна са шкодніцкім плянам.

Для таго, каб затармазіць скарыстаньне прамысловага таннага мясцовага апалу, шкоднікі, як паказвае Рамзін рабілі ўсё, што маглі. Імі ўжываліся ўсе меры да таго, каб трымаць на высокім узроўні сабекошт торфу. У гэтых мэтах звужаліся да крайніх межаў магчымасьці прыстасаваньня вельмі выгаднага спосабу здабычы торфу—фразэрнага.

Не даючы прамысловасьці таннага мясцовага апалу і трымаючы яе на далёкім прывозным апале, шкоднікі разам з тым усяляк затрымлівалі ажыцьцяўленьне данецкай звыш-магістралі, якая павінна была злучыць Донбас з цэнтральна-прамысловым раёнам СССР. Тармажэньне проэкту звышмагістралі дасягалася наступным падзяленьням роляй паміж шкодніцкімі організацыямі: у той час як шкоднікі з Дзяржплану ўсюды адстойвалі неабходнасьць пабудовы звыш-магістралі, іх субраты з НКСП заядла даводзілі нерацыянальнасьць і нерэнтабельнасьць гэтага прадпрыемства. У выніку ў бясконцых спрэчках шкоднікаў адзін з адным зусім бязвынікова „кануў в вечнасьць“ 2-3 гады.

Падобна-ж работа „ўхаластую“ праводзіліся „прампартыяй“ і ў галіне электрабудаўніцтва. У прыватнасьці нічога амаль не рабілася на электрафікацыі Донбасу нібы з тае прычыны, што выгадней будзе забясьпечыць яго электраэнэргіяй Днепрабуду.

Шкодніцкія пляны і спосабы іх ажыцьцяўленьня Рамзін выкладае ва ўсіх дэталях і з усёй паўнатой. Але пры гэтым, адказваючы на пытаньні прадстаўнікоў абвінавачаньня і суда, ён стараецца правесьці рэзкую дэмаркацыйную лінію паміж Рамзіным-шкоднікам і Рамзіным-вучоным. Падсудны доўга і шырока пераконвае суд у тым, што ў сваіх навуковых творах і працах ён шкодніцкіх установак не праводзіў. Але гэтыя спробы закончыліся для яго поўным канфузам.

Далей суд пераходзіць да допыту падсуднага Ларычава.

Пуанкарэ, Мілюкоў, Рабушынскі і кампанія

Для допыту выклікаецца падсудны Фядотаў. Яму задаецца наступнае пытаньне. Ці пацьвярджаеце вы, што ў часе спатканьня з Карпавым апошні расказваў вам аб Пуанкарэ? Фядотаў адказвае станоўча. У часе паездкі Фядотава ў Бэрлін у 1928 годзе да яго спэцыяльна прыехаў з Парыжу Карпаў і меў з ім доўгую гутарку. Карпаў расказаў, што Пуанкарэ дамагаецца таго, каб была падрыхтавана ўнутры СССР больш спрыяючая глеба для інтэрвэнцыі. Пуанкарэ патрабаваў ад „Таргпрома“ рэалізацыі сваіх абяцаньняў аб організацыі нездавальненьня насельніцтва СССР. Толькі калі „Торгпром“ правядзе гэту работу, з ім будуць гутарыць аб далейшым.

Выкліканы судом у якасьці сьведкі былы намесьнік старшыні Дзяржпляну СССР праф. Асадчы заяўляе, што ён уваходзіў у склад ЦК „Прампартыі“ разам з Рамзіным, Каліньнікавым, Фядотавым, Ларычавым і Шэйнам. Праф. Асадчы паказвае, што яму было вядома аб падрыхтоўцы інтэрвэнцыі „Прампартыі“ і аб сувязях „Прампартыі“ з загранічнымі коламі.

—Я ведаў,—гаворыць Асадчы,—што ў 1928 годзе Рамзін і Ларычаў былі ў Парыжы, дзе мелі спатканьне з прадстаўнікамі „Торгпрома“ і прадстаўнікамі французскага генштабу аб падрыхтоўцы інтэрвэнцыі. Ведаў, што генэрал Лукомскі ў той час называўся ў якасьці кандыдата на пост камандуючага інтэрвэнцыянісцкай арміі. Асадчы заяўляе, што на чале інтэрвэнцыі павінна была стаяць Францыя, у руках якой згуртоўваецца кіраўніцтва інтэрвэнцыяй, інструктаж і матэр'яльнае забесьпячэньне. Непасрэднае-ж ажыцьцяўленьне інтэрвэнцыі ўскладаецца на Румынію і Польшчу. З лімітрофных дзяржаў у якасьці ўдзельніка інтэрвэнцыі асабліва настойліва называлася Фінляндыя. Асадчаму было вядома таксама, што сувязь ЦК „Прампартыі“ з Парыжам ажыцьцяўляецца праз паноў К. і Р., агентаў французскай службы ў Маскве. Асадчы ведаў таксама і аб буйных сумах, якія атрымлівала „Прампартыя“ з заграніцы.—У пачатку 1930 г.—гаворыць Асадчы—„Прампартыяй“ вялікія надзеі ўскладаліся на кулацкія паўстаньні, на абвастрэньне ўнутранога становішча ў СССР. Асадчы падкрэсьлівае, што зьяўленьне артыкулу тав. Сталіна „Головокружение от успехов“, які ён называе гістарычным, пазбавіла „Прампартыю“ надзей на сялянскія выступленьні супроць савецкай улады. Асадчы падрабязна апісвае сваё спатканьне ў якасьці прадстаўніка ЦК „Прампартыі“ з прадстаўніком „Торгпрома“ Дэянісавым, якое адбылося 10 ліпеня 1930 году ў Бэрліне.

У заключэньне Асадчы заяўляе, што ён вымушан „усенародна пакаяцца ў той контр-рэвалюцыйнай рабоце, якую ён вёў супроць савецкай улады і супроць справы социялістычнага будаўніцтва“.

У адказ інтэрвэнтам

Мы, вучні 9 школы, уносім 18 руб. на пабудову дырыжабля „Праўда“, 10 руб. на пазыку „5-годка—у 4 гады“ на карысьць політзьняволеных і 3 руб. 23 кап. у Авіохэм ад лётарэі і выклікаем пасьледваць нашаму прыкладу 2-ю, 3-ю, 4-ю і 5 школы.

Вучні 9 школы.

Палова рабочых у Польшчы бяз працы

Усе сродкі аддаюцца на вайсковыя выдаткі, на падрыхтоўку вайны супроць Савецкага Саюзу

Экономічны крызіс усё больш сьціскае Польшчу. Фашыстыя павялі ўсю краіну да поўнага зруйнаваньня. Аддаючы ўсе сродкі на вайсковыя выдаткі, падрыхтоўваючыся да вайны з Савецкім Саюзам, польская буржуазія высмактвае апошнія сілы з працоўных.

Год ад-году польская прамысловасьць скарачае сваю вытворчасьць, бо невыстарчае ў польскага ўраду сродкаў і на падрыхтоўку вайны і на адбудову гаспадаркі. Вытворчасьць асноўных галін прамысловасьці Польшчы зьнізілася на 40 проц. супроць 1928 г., а ў зьвязку з гэтым сярод рабочай клясы Польшчы пануе страшэннае беспрацоўе.

40 проц. усіх рабочых Польшчы ня маюць ніякай працы і жывуць у надзвычайнай галечы і ўбостве. Каля 20 проц. усіх рабочых—напалову беспрацоўныя, г. зн. працуюць некалькі дзён на тыдні. Адсюль выходзіць, што на кожныя тры рабочыя—два беспрацоўныя, ці напоўбеспрацоўныя.

Толькі 40 проц. усіх працоўных Польшчы маюць сталую працу, але што яны за гэтую працу маюць? Яны зарабляюць за месяц, у сярэднім, 100 злотых (22 руб. на нашы грошы). Гэты заработак ледзь-ледзь выратоўвае рабочыя сем'і ад галоднай сьмерці.

А тым часам прамыслоўцы праводзяць яшчэ далей зьніжэньне вось гэтай мізэрнай зарплаты рабочае клясы Польшчы.

У Лодзі ўласьнікі тэкстыльных фабрык дамагаюцца зьніжэньня зарплаты тэкстыльшчыкам на 20-40 проц. Адначасова пагоршваюцца бытавыя ўмовы працоўных, закараняецца сыстэма штрафаў, якія на шмат зьмяншаюць заработак рабочага. Прадпрыемцы вымагаюць ліквідаваць двухтыднёвую выплату пэнсіі, якую да гэтага часу мелі рабочыя Польшчы на некаторых прадпрыемствах.

Такое становішча рабочага Польшчы. Калі-ж дадаць да гэтага нячуваны політычны тэрор, які кідае ў турму кожнага рабочага, шукаючага ў рэволюцыйнай бойцы выратунку, дык малюнак будзе зусім зразумелы. Турмы Польшчы перапоўнены рэволюцыйнымі рабочымі, асабліва вялікіх памераў набылі арышты ў часе выбарчай кампаніі ў польскі сойм, калі пілсудчыкі ўсімі сіламі намагаліся заткнуць рот ворагам фашызму.

З дапамогаю нячуванага тэрору пілсудчыкам удалося правесьці 248 сваіх дэпутатаў у новы сойм. Але апошняе слова застаецца за рэволюцыйнай рабочай клясай і сялянствам. Шлях працоўных Польшчы—да ўзброенага паўстаньня, да пролетарскай рэволюцыі.

Усе, як адзін у шэрагі ТД-Авіяхэму

Мы, вучні Старобінскай сямігодкі 6-й клясы „А“, заслухаўшы інформацыю аб дзейнасьці „прамысловай партыі“, патрабуем ад пролетарскага суду ўжыць да контррэволюцыянэраў вышэйшую меру социяльнай абароны—растрэл.

У адказ на спробы сарваць социялістычнае будаўніцтва абавязваемся ўмацніць свае вайсковыя веды.

Усе, як адзін, уступаем у шэрагі ТД-Авіяхэм.

Мы просім узнагародзіць АДПУ орданам Леніна.

Па даручэньню агульнага сходу Шчэрба.

„Чырвоную Зьмену“—у масы!

Тэмпы, узятыя ў пяцідзёнцы, працягваць і надалей

Социялістычны дагавор павінен быць выканан

Завербавалі 80 падпісчыкаў

На адбыўшымся вечары комсамольскіх ячэек м. Лельчыцы было абгаворана пытаньне аб юнацкім друку. Тут-жа па ініцыятыве дакладчыка была разгорнута падпіска на „Чырвоную Зьмену“. У выніку—сабрана 80 гадовых і паўгадовых падпісчыкаў на „Чырвоную Зьмену“. Вылучана брыгада для збору падпіскі сярод беспартыйнай працоўнай моладзі.

Г—н Х.

Што-ж яны робяць?

Ячэйка ЛКСМБ пры Гомел... канторы сувязі пытаньнямі ра... сюджваньня „Чырвонай Зь... не займаецца (газэту выпісвае 3 ... Упаўнаважанага няма. У час ... дзёнкі гэтыя недахопы павінны ліквідаваны. Ячэйка сувязі ў ... таньнях распаўсюджваньня ... павінна быць прыкладам для ... ніх ячэек гораду.

Лейцын

Больш увагі пяцідзёнцы

Па ячэйцы ЛКСМБ заводу „Дрэваапрацоўшчык“ дрэнна праходзіць ударная пяцідзёнка. Вылучаныя ўпаўнаважаныя не працуюць. Толькі ў зборачным цэху, дзе працуе ўпаўнаважаным т. Цымбал, праца праводзіцца больш менш здавальняюча. Бюро ячэйкі павінна аддаць больш увагі мерапрыемствам пяцідзёнкі з тым, каб па ўсім прадпрыемстве былі дасягнуты адпаведныя посьпехі.

Саламонаў П.

Глухі да крытыкі

Аб Рудзенскай яч., Драчка... яч. і яч. „Новы Шлях“ уж... калькі раз паведамлялася ў ... як аб ячэйках, якія нічога ... бяць па распаўсюджваньню „... вонай Зьмены“. Цьвердалоб... бюро гэтых ячэек прымушае ... нуцца да Сьмілаўскага РК ЛК... які павінен прыняць адпав... захады.

Б.

Да канца ліквідаваць прарывы

Петрыкаўскі комсамол уключыўся ў бой за ле...

У „Чырвонай Зьмене“ ад 11-XI, № 260 быў зьмешчан артыкул пад назвай: „Петрыкаўскі леспрамгас арваў плян загатовак“. Па гэтаму артыкулу леспрамгас склікаў нараду кіраўнікоў усіх вучасткаў, на якой абгаварылі пытаньне аб ліквідацыі адзначаных у артыкуле прарываў. На нарадзе дадаткова выявілася, што некаторыя кіраўнікі вучасткаў яўна па-шкодніцку адносіліся да выкананьня плянаў лесазагатовак, у шэрагу месц сельсаветы і іншыя організацыі ня прымалі надежных мер у адносінах кулака і заможнай часткі вёскі, якам ня выконвала свайго заданьня па вывазцы лесу, таксама і адміністрацыя леспрамгасу не забясьпечыла рабочых вопраткай, харчаваньнем і г. д.

Нарада адзначыла, што Лесбелаб'яднаньне яшчэ дагэтуль не дало леспрамгасам установкі, колькі год і як рабіць вучасткі, што тармозіць працу.

Нарада рашуча, па-бальш... ўдарыла па гэтых фактах. У... вікі нарады абвясьцілі сябе ... нымі на выкананьне плянаў загатовак і абвясьцілі самую ... вую барацьбу з усялякага ... ўкрытымі і адкрытымі разва... нямі аб нерэальнасьці пляна... бот і прымірэнчымі адносіна... кулацка-заможнай часткі вёскі.

Райком комсамолу таксама ... няў адпаведныя захады на ... пазачарговым паседжаньні заслухаў інформацыю леспра... і спажыўтаварыства аб ходзе ... товак і пастанавіў уключыць організацыю КСМ у бой за ле...

Брыгада ЦК ЛК...
Новік і Альтшулер і
ВСНГБ.

АДКАЗНЫ РЭДАКТ...
РЭДКОЛ...

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599